Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІСТАПАДА 2017 г. АЎТОРАК №229 (28593)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Палац, дзе ў сцяны быў свой голас**

СТАР. 13

**Увага: прамая лінія!**

**Газета «Звязда» праводзіць прамую лінію па тэме «Як спажыўцу адстаяць свае правы?» Ці можна вярнуць у краму абутак, набыты падчас распродажу? Што рабіць, калі замарожаная рыба аказалася сапсаванай? Ці можна не плаціць за стрыжку, калі яна вам не падабаецца? Куды звяртацца, калі вам прадалі бракаваны тавар?**

Гэтыя і іншыя пытанні можна будзе задаць у чацвер, **30 лістапада, з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **287-18-71.** Адказваць на іх будзе **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраў-на СУША.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэлефоне 287-17-50 ці даслаць на электронны адрас lubneuskaya@zviazda.by з пазнакай «прамая лінія».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Кошт легкавога аўтамабіля «БелДжы» беларускай зборкі будзе ў дыяпазоне 17—25 тысяч долараў. Льготныя ўмовы крэдытавання, як і было абяцана кіраўніцтвам краіны, ужо распрацаваны, і днямі праект дакумента пойдзе ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Гаворка ідзе аб льготных крэдытах на сем гадоў пры першапачатковым узносе — каля 10% першапачатковага кошту аўтамабіля. Калі гаварыць пра перспектывы, то складана будзе. Няпроста. Але мы ставім задачу ў наступным годзе выйсці на 25 тысяч аўтамабіляў, а потым на 10 тысяч дадаваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9953 ▼ |
| Еўра | 2,3803 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0342 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0743 ■ |

ISSN 1990 - 763X

# На глушцовым таку



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Каб трапіць на глушцоў ток, не абавязкова чакаць вясны і ехаць у лясны гушчар — дастаткова ў любы час накіравацца ў Бярэзінскі біясферны запаведнік і пагуляць па Музеі прыроды — тут нядаўна прайшла рэканструкцыя экспазіцыйных залаў. Глушцоў ток — адна з самых цікавых інсталяцый у аднаўленай экспазіцыі. Супрацоўнік аддзела турызму Бярэзінскага біясфернага запаведніка і экскурсавод Музея прыроды Алена ВАШКЕВІЧ клапоціцца аб тым, каб велічныя птушкі ў ёй выглядалі як жывыя.**

■ Вы прасілі расказаць

## ЯК АТРЫМАЦЬ ПАВЫШАНУЮ ПЕНСІЮ?

### У Мінпрацы і сацабароны растлумачылі, як яе можна павялічыць

**Напэўна, усе, хто зацікаўлены ў тэме, ведаюць, як пенсія разлічваецца: яна залежыць ад заробку і стажу працы. Мы, вядома, прывялі спрошчаную схему, таму што тут, як і ўсюды, ёсць свае нюансы. Але ў цэлым схема такая. Таму, калі чалавек хоча мець у будучыні прыстойную пенсію, ён можа меркаваць: трэба ўладкавацца на працу, якая добра аплачваецца, і атрымліваць зарплату легальна, а не ў канверце. Гэта значыць, што работадаўца будзе выплачваць за вас страхавыя ўзносы, памер якіх і ўплывае на памер пенсіі.**

**Але што рабіць, калі ў вас пенсія ўжо, як кажуць, на носе? І тут прадугледжана рашэнне, якое падыдзе перш за ўсё людзям з неблагім здароўем. Ну а самым безабаронным, тым, хто неканкурэнтаздольны на рынку працы, дзяржава ўстанавіла надбаўкі да іх маленькіх пенсій, каб падтрымаць іх. Таксама надбаўкі да пенсіі ўстаноўлены людзям, якія маюць асаблівыя заслугі перад дзяржавай. А цяпер пра ўсё гэта падрабязней...**

### Як можна павялічыць сваю пенсію па ўзросце?

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны растлумачылі, што можна зрабіць, калі ваш узрост набліжаецца да пенсійнага і зарабіць сабе большую пенсію вы ўжо не можаце з-за чыста фізічнага недахопу часу на гэта. Павелічэнне памеру прызначанай па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту пенсіі магчыма, калі вы працягнеце працаваць пасля яе прызначэння і на гэты час адмовіцеся ад атрымання пенсіі.

СТАР. 4

■ Аты-баты

## ЛІСТАПАД У ПЕЧАХ

### Як адчувае сябе новае папаўненне ў войску

**Лістапад для кожнай вайсковай часці — час асаблівы. Ідуць у запас тыя салдаты і сяржанты, якія скончылі тэрміновую службу. На змену ім прыходзіць новае папаўненне, якому трэба не толькі спасцігнуць таямніцы ваеннай навукі, але і адаптавацца ў новым калектыве, а таксама звыкнуцца з новым распарадкам дня. Як жа гэта адбываецца ў 72-м гвардзейскім аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых камандзіраў?**

СТАР. 3



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Радавы Арцём КУНЦІКАЎ і малодшы сяржант Раман БАГРОЎ.**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!